В финале повести любовь разрушена эгоистичной и злой особой, а также глупостью и нерешительностью главного героя Дмитрия Санина, погубившего своё счастливое будущее с возлюбленной.

**Заключение.** Изучив повести И. С. Тургенева, мы пришли к выводу, что автор обычно создаёт женский образ весьма скромным, ранимым, беззащитным. Девушка предстает на страницах тургеневских повестей, как правило, мечтательной, романтичной натурой, воспитанной вдали от светских балов, не избалованной роскошью, дорогими нарядами. Для каждой из тургеневских барышень характерна идеализация их богатого внутреннего мира. Писатель обычно не изображает их невероятными красавицами, во многих случаях это обычная девушка, не обладающая идеальными чертами лица. Но она наделена сильным характером. Перед читателем раскрывается женщина с невероятной волей, любящим и верным сердцем. Автор задаётся целью показать читателю, насколько сильной и самоотверженной может быть девушка, несмотря на внешнюю хрупкость и нежность.

И. С. Тургенев создает образы девушек, которые постигают силу первой любви, передаёт их эмоции и переживания, рассказывает о том, как они справляются с нахлынувшими чувствами и как складывается их дальнейшая жизнь. Писатель представляет нашему вниманию ошибки, совершаемые людьми в вопросах любви и благополучия, показывает, насколько поступки и необдуманные действия героев способны изменить их дальнейшую жизнь. Образ женщины в произведениях И. С. Тургенева — идеал чистоты и непорочности, верности и преданности.

**Список цитируемых источников**

1. *Дячук, Т. В.* Концепт «писатель» в литературных воспоминаниях второй половины XIX — начала XX веков : дис. … канд. филол. наук : 10.01.01 / Т. В. Дячук. — СПб., 2005. — 208 л.
2. *Тургенев, И. С.* Полное собрание сочинений и писем : в 30 т. / И. С. Тургенев. — М. : Наука, 1980. — Т. 5. — 544 с.
3. *Тургенев, И. С.* Полное собрание сочинений и писем : в 30 т. / И. С. Тургенев. — М. : Наука, 1981. — Т. 6. — 496 с.
4. *Тургенев, И. С.* Полное собрание сочинений и писем : в 30 т. / И. С. Тургенев. — М. : Наука, 1981. — Т. 8. — 542 с.

УДК 811.161.3'37

**Л. Д. Бабко**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы, Рэспубліка Беларусь*

*Навуковы кіраўнік*
*Т. М. Пучынская*

## МАСТАЦКАЯ РОЛЯ КОЛЕРУ Ў ПАЭТЫЧНЫХ ТВОРАХ НА ТЭМУ ЧАРНОБЫЛЯ

**Уводзіны.** Мастакі слова часта звяртаюцца да колераабазначэння, якое валодае багатымі эстэтычнымі магчымасцямі. Колер здольны глыбока ўздзейнічаць на свядомасць чалавека, таму заканамерна, што ў літаратурных творах ён набывае спецыфічныя ўласцівасці «інтэгральнага» вобраза і сродка мастацкай выразнасці.

Колеравая сімволіка характэрна паэтычным творам на тэму Чарнобыля. Пісьменнікі актыўна выкарыстоўваюць каларыстыку ў аўтарскай сістэме ідэйна-мастацкіх і выяўленчых сродкаў. Дадзенае пытанне, аднак, у самастойную літаратуразнаўчую праблему пакуль не вылучана і патрабуе далейшага разгляду.

**Асноўная частка.** Малюнкі чарнобыльскай рэчаіснасці вызначаюцца сумнымі фарбамі і нараджаюць складаны душэўны стан лірычнага героя (творы Р. Барадуліна, А. Вялюгіна, А. Грачанікава, М. Мятліцкага, П. Панчанкі і інш.).

Найбольш часта ў вершах на тэму Чарнобыля сустракаецца *чорны колер,* які традыцыйна ўвасабляе бяду, гора, цяжар. Ён дапамагае стварыць маштабную карціну экалагічнай катастрофы, а таксама выявіць глыбіню маральных праблем, звязаных з Чарнобылем. Прывядзём прыклады са зборніка «Зорка Палын»: *«чорная зона знявечаных душ»* (А. Канапелька), *«Чарнобыля счарнелыя радкі // ў пасведчанні нявіннага дзіцяці»* (Я. Мальчэўская), *«А сёння ўсюды цьмяна, // дымна, чорна, // Не звіняць у небе жаўрукі»* (П. Панчанка), *«чорная доля шостага жніўня»* (С. Панізнік), *«чорны вецер… чуе недзе здалёку сонм жывых галасоў»* (М. Скобла), *«і чорным цветам расцвіталі грушы»* (А. Сыс) [1].

Я. Сіпакоў у паэме «Одзіум» звяртаецца да міфаколеравага жывапісу, аснову якога складае чорны колер: *«Чорнае слова, як чорнае сонца, бязлітасна // ўскацілася на беларускі небасхіл. // Яно, нібы чорнае зацьменне, усё пачарніла — // і зялёную траву, і празрыстую ваду, // і блакітнае неба»* [1, с. 228—229]. Выраз-рэфрэн *«Чорная быль — Чарнобыль. // Чорны баль — Чарнобаль. // Чорная бель — Чарнобель. // Чорны боль — Чарноболь»* [1, с. 229] выяўляе агульную настраёва-колеравую гаму твора і ўзмацняе яго драматычнае гучанне.

© Бабко Л. Д., 2023

Репозиторий БарГУ

Чарнобыль прадвызначыў з’яўленне ў паэзіі «чорнага колера-знака». Сонца традыцыйна ўслаўляе жыццяносную сілу. Аднак пасля атамнага калапсу з’явіўся страх перад нябесным свяцілам, якому здаўна пакланяліся нашы продкі. У паэзіі створаны вобраз «чорнага сонца», у злавеснае аблічча якога беларускія паэты ўзіраюцца і на пачатку XXI стагоддзя: *«Ёсць чорнае сонца. // Малыя ўсе меры, // Каб мераць бясконцы пагрозлівы цень»* (Л. Рублеўская) [1, с. 134].

Да сімволікі чорнага колеру звяртаецца ў творах Р. Барадулін. Душу яго лірычнага героя ў вершы «Лямант» ахоплівае неспакой ад прадчування, што родная зямля, яе слова і песні могуць «у радыяктыўным пыле задыхнуцца». Унутраная трагедыя лірычнага героя нараджае хвалюючыя запытанні: *«Няўжо гэта людзі павінны // Зіхоткай хмурыны, // Зямлі і вады, // Як бяды, // Як духу злога, // Баяцца // Пад чорнымі крыламі слова // Радыяцыя?»* [2, с. 116].

Даволі часта ў вершах чарнобыльскай тэматыкі чорны колер спалучаецца з *белым*, які сімвалізуе дасканаласць, духоўнасць, надзею, узвышэнне жыцця, чысціню і вечнасць. Для чарнобыльскай паэзіі ў цэлым характэрна наяўнасць кантраснай колеравай палітры «белы — чорны», якая адпавядае лексічнай пары «добры — дрэнны». Так, лірычны герой В. Зуёнка ў вершы «Пялёнкі над балконам» імкнецца пераадолець стан трывогі. Аптымістычныя спадзяванні яму навявае выгляд балкона з вывешанымі белымі квадратамі пялёнак, якія сімвалізуюць жыццё: *«А пялёнкі — як выстаўка суперсучасная // ў стылі «Малевіч». // Толькі белых квадратаў — не чорных — // узносіцца знак»* [3, с. 22]. Паэт вітае з’яўленне новага чалавека, народжанага нібы насуперак знішчальнаму Чарнобылю. На кантрасце чорнага і белага колераў, якія ўвасабляюць экзістэнцыяльнае супрацьстаянне дабра і зла, пабудаваны верш А. Сыса «Чорная быль»: *«белы цень»*, *«белы прывід»*, *«Белы Храм»*; *«чорная быль»*, *«чорныя ільды»*, *«чорны хвойны лес»*, *«чорны цвет груш»* [1, с. 147].

Чорны і белы колеры (лексічная пара «смерць — жыццё») вызначаюць вобразны змест верша М. Башлакова «Птушкі белыя, птушкі палескія…»: *«Вашы белыя, белыя крылы // Ад бяды пачарнелі // чарнобыльскай»* [1, с. 25]. У вершы А. Дуброўскага «Я ў першароднасці прымаю…» белы колер таксама, як і ў вершы М. Башлакова, увасабляе збавенне, адраджэнне і проціпастаўляецца чорнаму колеру, які сімвалізуе няшчасце. Паэт верыць, што «белы снег» выратуе радзіму ад бяды: *«Не проста выправіць агрэх… // Таму лунай над краем родным // Хавай палын, халодны снег!»* [1, с. 63].

Значэнне белага колеру ў вершах чарнобыльскай тэматыкі ў залежнасці ад кантэксту твора рознае. Ён можа атаясамлівацца з вобразамі ўрачоў, якія змагаліся за жыццё людзей, з бальнічнай палатай, дзе ратавалі пацярпелых ад радыяцыі, і, нарэшце, з хваробай і нават самой смерцю: *«бледныя ў хлопца вусны, нямыя: // Кроў папівае з іх лейкемія»* (А. Лойка) [1, с. 102]; *«Гарбее чорны журавель. // А студня — глянь! — // запакавана // уся // ў выцвілую бель, // нібыта ў саван, // цэлафана»* (Г. Пашкоў) [1, с. 128].

Жоўты колер у адлюстраванні чарнобыльскага пейзажу выкарыстоўваецца не так актыўна, як чорны і белы. У чарнобыльскай паэзіі ён мае пераважна негатыўнае значэнне — сімвалізуе хваробу, смерць, часам набывае сімвалічны змест атручанай радыяцыяй зямлі. Так, у мастацкай палітры М. Мятліцкага «колер жаўцяны» вясновага абнаўлення і сонечнай прамяністасці «ў сінечы прадвесня» страчвае пазітыўную сэнсавую напоўненасць і, набываючы народную традыцыйна-сімвалічную сутнасць, становіцца колерам расстання і гора: *«Гэта жоўтай жуды // Колер самы гарачы, праменны»* [4, с. 137].

У вершы Д. Бічэль-Загнетавай «Цудадзейнасць» жоўты колер звязваецца з матывам пакаяння, віны лірычнага героя за трагічныя наступствы Чарнобыля: *«Мята, расходнік, чаборык і лютнік... // Янак-ды-Мар’я на сцежцы лясной // не вінавацяць віной-жаўцізной. // Чыстае зелле праз яд прарасце, //цудам малітвы смерць адвядзе»* [1, с. 27].

Зялёны і сіні колеры ў паэтычных творах чарнобыльскай тэматыкі выкарыстоўваюцца значна радзей за іншыя фарбы, аднак яны выконваюць важную ролю. Звычайна гэтыя колеры ўвасабляюць штосьці светлае, яркае і паказваюць свет да трагедыі, прыроду, якая яшчэ не была атручаная. Так, Г. Атрошчанка ў вершы «Споведзь перасяленкі» апісвае свой родны край наступным чынам: *«Вось тут, каласілася жыта, // Квітнеў сіні лён, як заўжды // Сцяжына мая — не забыта! // Бяжыць праз маленства, гады»* [5]. Памяць захавала вобраз радзімы, калі беглі яшчэ чыстыя, не атручаныя ручаёчкі-сцяжыны, усё квітнела, налівалася яркімі краскамі. Аднак лірычная гераіня больш не зможа вярнуцца ў родныя мясціны, ёй самотна глядзець на абеліскі, на хаты і на сяло, якога больш няма. У вершы «Не забыць!» Г. Атрошчанка піша, што, нягледзячы на бяду, прырода зелянее, аднак яна ўжо нежывая: *«Пуста на вуліцы. Ціха ў полі, // Только на ўзлеску бялеюць бярозы. // Што ім Чарнобыль і тыя марозы! // Зноў зелянеюць у траўні, на волі»* [5]. Лірычны герой В. Гардзея з сумам і адначасова з надзеяй назірае за прыродай: *«Зялёныя шаблі аеру // На сажалках вецер згінае // Бядую, чакаю і веру: // Загоіцца рана скразная»* [1, с. 49].

**Заключэнне.** Колераабазначэнні ў паэтычных творах на тэму Чарнобыля з’яўляюцца адначасова «інтэгральнымі» вобразамі і сродкамі выяўлення аўтарскай думкі. Сімвалічнае значэнне колеру — асноўная ўласцівасць каларыстыкі, якая спрыяе больш глыбокаму раскрыццю маральна-філасофскага зместу твора.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. Зорка Палын : творы беларускіх паэтаў пра чарнобыльскую трагедыю / уклад. А. І. Бельскага, прадм. С. С. Шушкевіча. — Мінск : Маст. літ., 1993. — 225 с.

2. *Барадулін, Р.* Самота паломніцтва / Р. Барадулін. — Мінск : Маст. літ., 1990. — 270 с.




Репозиторий БарГУ

3. *Зуёнак, В.* Лета трывожных дажджоў: Вершы / В. Зуёнак. — Мінск : Маст. літ., 1990. — 158 с.
4. *Мятліцкі М.* Чаканне сонца : Вершы / М. Мятліцкі. — Мінск : Маст. літ., 1994. — 222 с.
5. *Атрошчанка, Г.* Споведзь перасяленкі [Электронны рэсурс] / Г. Атрошчанка. — Рэжым доступу: https://ggcbs. gomel.by/greensteps/pages/poesy_opus.html#r284 . — Дата доступу: 03.04.2023.

УДК 811.161.3.09’373

**Д. П. Балакар**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы, Рэспубліка Беларусь*

*Навуковы кіраўнік*
*А. І. Белая*

## ПАЭМА МІКОЛЫ ГУСОЎСКАГА «ПЕСНЯ ПРА ЗУБРА» — УЗНЁСЛЫ ГІМН АЙЧЫНЕ

**Уводзіны**. Сёлета споўнілася 500 гадоў з часу выдання паэмы «Песня пра зубра» (1523), напісанай у 1522 г. па просьбе папы рымскага Льва X, які хацеў пачуць праўдзівае паэтычнае слова пра паляванне на зуброў. Напісана паэма на лацінскай мове — на той час мове навукі, культуры, міжнародных зносін у Еўропе. Назва гэтай паэмы ў арыгінале — “Carmen de statura feritate ac venatione bisontis”, што ў перакладзе з латыні гучыць як «Песня пра выгляд, лютасць зубра і паляванне на яго».

М. Гусоўскі — сын баярына-паляўнічага, таму ён змог падрабязна апісаць знешні выгляд, звычкі і паводзіны зубра, а таксама расказаць пра арганізацыю палявання: *«Вырасшы ў лесе і зведаўшы ўсё гэта змалку, / Я ўваскрашаю карціны былога»* [1, с. 131], таму цяпер паэму характарызуюць як твор пра родны край і народ, роздум пра лёс Радзімы, пра яе месца на шляхах гісторыі, які гучыць урачыста, як гімн Айчыне.

**Асноўная частка**. Паэма «Песня пра зубра» пачынаецца з апісання бою быкоў у Рыме. Паэту-патрыёту прыкра было глядзець на гэтае забойства магутных звяроў, якія зрабіліся бездапаможнымі праз чалавечае вераломства. Аўтар прыгадаў зубрыныя ловы, рыцарскія традыцыі сваёй Айчыны, прыгажосць яе лясоў і няскораны дух яе жыхароў: *«Пушча сваёю красой захапляе і яснавяльможных / Военачальнікаў нашых, што проста з паходаў / Сталі бівакамі ў ёй»* [1, с. 131]. Галоўны герой паэмы — зубр, які з’яўляецца ўвасабленнем роднага краю, сімвалам яго былой магутнасці: *«Такога магутнага звера шчасная доля, як дзіва часоў першабытных / Толькі шчэ ў нас захавала, пад зоркай Палярнай»* [1, с. 124]. Паэт адухаўляе зубра, прыпісвае яму вышэйшыя маральныя якасці і грамадзянскія рысы характару (*«Быў і застаўся царом над усімі звярамі»* [1, с. 124]), надзяляе ляснога волата здольнасцю мысліць, чуйна рэагаваць на дабро і зло: *«Зубр, як мы лічым спрадвеку, хоць звер, але ж ратнік, / Ён прызнае перамогу, здабытую чэсна, — / Сілай на сілу, урожкі, і мужнасць на мужнасць»* [1, с. 133].

Гэта волат між звяроў, мужны і чуйны, *«кемлівы звер па прыродзе»*, ён усё бачыць і разумее. Зубр увасабляе дзяржаву, уладу, моц прыроды. Зубр — істота вольналюбная, не церпіць насілля, ваяўніча выступае супроць яго. Нават зранены, увесь працяты наскрозь дроцікамі, стрэламі, кінжаламі і мячамі, ён да апошняга ўздыху змагаецца са сваімі крыўдзіцелямі: *«Слепне ад злосці шалёнай: яму ўжо ўсё роўна — Дрэва калечыць ці лоўчага…»* [1, с. 148]. Сцэна гібелі зубра — адна з самых драматычных, але паэтычных і яркіх. М. Гусоўскі, карыстаючыся мастацкай умоўнасцю, уводзіць у тэкст паэмы развітальны маналог звера як прысуд жорсткасці і бесчалавечнасці: *«Смерцю маёй пацяшацца сышліся? Чакайце ж, / Я пакажу вам забойства — вякі не забудуць! / З храпам набраўшы паветра, разявіўшы пашчу, / Рыкам усіх аглушыў, скалануў наваколле»* [1, с. 150]. Раз’юшаны зубр доўга яшчэ бушуе, спрабуючы адпомсціць ворагам *«і за кроў, і за раны, і за парушанае мірнае жыццё»* [1, с. 139], але паступова сілы пакідаюць яго і, паводле звычаю, двое юнакоў клінкамі дабіваюць здабычу. *«Тыцнуўся ў снег і прыкленчыў, нібы пакланіўся / Шумнай дуброве: “Даруй, мая родная, ўсё мне”…»* [1, с. 151]. Апісваючы гэтае страшнае відовішча, паэт асуджае бессэнсоўнае знішчэнне зуброў, узнімае праблему беражлівых адносін да прыроды.

Паэма М. Гусоўскага — твор не толькі пра зубрынае паляванне, а і пра лёс усяго жывога на зямлі. Гэта твор, які сцвярджае роўныя правы і людзей, і звяроў, і птушак, і дрэў на нармальнае жыццё. Зубры жывуць статкам-абшчынай, кіруюцца спрадвечнымі законамі. У гурце — роўнае права на ўладу, строгі абавязак ахоўваць слабых, аддаваць свой вопыт і сілу на агульную карысць і дабро. Аўтар ухваліў паводзіны зуброў у адзінай сям’і як ідэальныя і перанёс іх на паводзіны ў людскіх сем’ях, заклікаў людзей ісці сцежкамі натуральных, гуманных узаемадачыненняў: *«Леташкі-цёлкі, бычкі-аднагодкі ў чародах — / Люба глядзець: скакункі, забіякі-задзіры»* [1, с. 126], *«Так на выгодзе лясной, у няспынным змаганні за кудзярок лугавога кіпрэю, / З бычка-зубраняці зубр вырастае, / Магутны, прысадзісты волат»* [1, с. 126]. Характарыстыкі, якімі аўтар надзяляе зубра, карэлююць з характарам, норавамі, звычаямі беларусаў — людзей мужных, шчырых, адкрытых, свабодалюбных.

Паэт захоплена закаханы ў свой край; ён дасканала ведае ўсе ягоныя гістарычныя, палітычныя, прыродныя і чалавечыя повязі-сувязі. А паколькі яму, паэту, пашэнціла паблукаць па свеце, пабачыць іншыя

© Балакар Д. П., 2023

Рэпазіторый БарДУ